# ФАЛЬКЛОР ЯК ВАЖНЫ КАМПАНЕНТ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

***В.С. Новак, А.А. Кастрыца***
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі

Актуальным кірункам у сістэме выхаваўчага працэсу вышэйшых навучальных устаноў з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, адной з асноўных задач якога з'яўляецца выхаванне глыбокай павагі да культуры народа Беларусі, яго традыцый, звычаяў, песеннай спадчыны. Гэта невыпадкова, бо ў сучасным разуменні патрыятызм – гэта гарманічнае спалучэнне да нацыянальных традыцый беларусаў з адданасцю і служэннем Айчыне.

Фальклор як універсальны від мастацтва, культурная спадчына мінулага і сёння валодае магутным, назапашаным за шматвяковы перыяд свайго бытавання патэнцыялам для выхавання высокай грамадзянскасці асобы, пачуцця патрыятызму, гонару за свой народ, яго невычэрпную скарбонку мудрасці і дасканалы маральна-этычны кодэкс.

На кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі задачы грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі вырашаюцца комплексна на аснове аўтэнтычных фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных матэрыялаў, апублікаваных, архіўных і палявых экспедыцыйных, бо аўтэнтычны фальклор беларусаў – выдатная крыніца адлюстравання народных уяўленняў пра патрыятызм як пра любоў да роднай зямлі, свайго народа (“Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла”), звычаяў і абрадаў, роднай мовы (“Што хутарок, то гаварок, што сяльцо, то слаўцо”), гісторыі народа (“Хто мову і веру мяняў, той не толькі сябе, а і маці прадаваў”).

Падчас лекцыйных і практычных заняткаў па дысцыплінах “Фалькларыстыка”, “Славянская міфалогія” выкладчык ставіць на мэце данесці да ўвагі студэнтаў важнасць ідэі захавання і адраджэння нацыянальнай культуры, а гэта немагчыма без глыбокага ведання яе відаў як на агульнаэтнічным, так і рэгіянальна- лакальным узроўнях. У сувязі з гэтым тэзіс “Усё вялікае пачынаецца з малога” (любоў да роднага краю спалучаецца з любоўю да малой радзімы) гучыць надзвычай актуальна пры вырашэнні задач выхавання любові да

Радзімы: у патрыятызме беларусаў агульнабеларускае пачуццё грамадзяніна спалучаецца як з пачуццём малой радзімы, так і роднай рэспублікі.

Добрай традыцыяй на філалагічным факультэце стала правядзенне фальклорнай дэкады: гэта канферэнцыі па выніках студэнцкай фальклорна-краязнаўчай практыкі “Падарожжа ў краіну народнай мудрасці”, сцэнізацыі фальклорных святаў і абрадаў, аб’яднаных агульным дэвізам “Ад прадзедаў спакон вякоў...”, а таксама правядзенне круглых сталоў “Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці фальклору Гомельшчыны”, прысвечаных фальклорна-этнаграфічнай спадчыне асобных раёнаў Гомельскай вобласці. Вышэйназваныя мерапрыемствы надзвычай эфектыўныя для развіцця творчых і інтэлектуальных здольнасцей студэнтаў, фарміравання працоўных, мастацка-эстэтычных уменняў і навыкаў, а таксама для развіцця нацыянальнай самасвядомасці на аснове далучэння маладых людзей да фальклорна-краязнаўчай дзейнасці.

Мэтай правядзення штогадовай канферэнцыі “Падарожжа ў краіну народнай мудрасці” з’яўляецца не толькі далучэнне студэнтаў першага курса да выканання надзвычай адказнай і пачэснай справы – захавання традыцый аўтэнтычнага фальклору падчас праходжання фальклорнай практыкі ў палявых умовах, але і творчая справаздача студэнтаў старэйшых курсаў, якія ў свой час таксама былі актыўнымі збіральнікамі скарбаў народнай мудрасці.

З павышанай увагай успрымаюць студэнты папярэдне падрыхтаваныя індывідуальныя выступленні выкладчыкаў, прысвечаныя патрыятычнай дзейнасці фальклarystаў-збіральнікаў мінулага, методыцы фіксацыі і афармлення фальклорных матэрыялаў, успамінам пра ўдзел у экспедыцыях часоў свайго студэнцтва, яскравым уражанням ад апошніх сустрэч з інфарматарамі-носьбітамі традыцыйнай культуры. Усе паведамленні суправаджаюцца мультымедыйнай прэзентацыяй і каменціраваннем вядучага дадзенага мерапрыемства.

Вялікую цікавасць выклікаюць гумарыстычныя сцэнічныя замалёўкі тых жыццёвых сітуацый, якія заўсёды ўзнікаюць падчас непасрэдных сустрэч з інфарматарамі. Добрай традыцыяй стала выступленне на канферэнцыі фальклорнага гурта “Вандроўнік”, у выкананні якога абавязкова гучаць песні, запісаныя ў апошніх экспедыцыях. Як правіла, да народнага меласу далучаюцца не толькі студэнты старэйшых курсаў, але і зацікаўленыя першакурснікі.

Падчас творчай прэзентацыі дэманструюцца выдадзеныя кнігі па духоўнай культуры розных раёнаў Гомельскай вобласці, пры гэтым увага засяроджваецца і на тых запісах, якія былі зроблены індывідуальна студэнтамі ў сваіх мясцовасцях. Падкрэсліваецца магчымасць кожнага са студэнтаў быць прадстаўленым у якасці патэнцыяльнага аўтара-збіральніка на старонках фальклорна-этнаграфічных зборнікаў, якія рыхтуюцца на кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі.

Менавіта падчас падрыхтоўкі розных сцэнарыяў фальклорных святаў і абрадаў (“Беларускі кірмаш”, “Гуканне вясны”, “Купалле”, “Каляды”, “Масленіца”, “Вячоркі”, “Народная гумарына”, “Вяселле”, “Хрэсьбіны” і інш.) і актыўнага ўдзелу ў іх студэнцкай моладзі вырашаюцца актуальныя пытанні выхавання грамадзяніна-патрыёта, натхнёнага ідэаламі дабра і справядлівасці, здольнага тварыць у імя Айчыны.

Адзначым, што сцэнізацыя абрадаў менавіта на глебе мясцовага фальклору дапамагае глыбей спасцігнуць і ўсвядоміць яго першасную крынічную прыгажосць, забяспечыць пераемнасць самабытнай культуры, гарманізуе адносіны паміж пакаленнямі. Сцэнічны паказ фальклорных святаў – своеасаблівы экзамен на веданне традыцыйнай культуры сваёй маленькай радзімы.

Кожная палявая экспедыцыя падчас правядзення вучэбнай фальклорна-краязнаўчай практыкі не толькі праверка тэарэтычнай падрыхтаванасці студэнтаў як фалькларыстаў-збіральнікаў, але і на чалавечнасць, грамадзянскую сталасць, бо кожная сустрэча з вяскоўцамі і гараджанамі-інфарматарамі, як правіла, выяўляе іх індывідуальныя лёсы, высокі маральна-этычны патэнцыял, раскрывае светапогляд, пераконвае ў мудрасці народнай філасофіі, жыццёвым аптымізме. Атрыманыя студэнтамі ў экспедыцыях матэрыялы і ўяўленні пра каштоўнасць, прыгажосць і адметнасці ўсяго роднага, уласцівага свайму краю, – аснова выхавання пачуцця чалавечай годнасці і гонару за народ. У гэтай сувязі варта прыгадаць словы М.А. Чарнышэўскага: “Патрыёт – гэта чалавек, які служыць радзіме, а радзіма – гэта найперш народ”.

Выхаваўчы і адукацыйны працэс, як вядома, гэта стварэнне ўмоў для інтэлектуальнага і духоўнага развіцця студэнтаў, для станаўлення іх як сапраўдных прафесіяналаў, здольных рэалізавацца ў розных відах дзейнасці, запатрабаваных высокім узроўнем развіцця сучаснага грамадства. Менавіта таму ініцыятыўнасць, крэатыўнасць, гатоўнасць да набыцця новых ведаў, уменняў і навыкаў шляхам асобаснай

уключанасці ў працэс навучання, здольнасць да нестандартнага і творчага асэнсавання праблем, самастойнасць у прыняцці рашэнняў з'яўляюцца прыярытэтнымі для студэнтаў вышэйшых навучальных установ.

Правядзенне фальклорна-краязнаўчай практыкі ў палявых умовах, падрыхтоўка індывідуальных творчых студэнцкіх прэзентацый па яе выніках, канферэнцыя па фальклорнай практыцы, сцэнізацыя традыцыйных святаў і абрадаў у студэнцкіх аўдыторыях, бібліятэках і школах горада Гомеля, удзел студэнтаў у падрыхтоўцы фальклорна-этнаграфічных зборнікаў па духоўнай культуры асобных раёнаў Гомельшчыны – гэта і ёсць выхаванне студэнтаў сапраўднымі грамадзянамі-патрыётамі.